ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Віцебскі пралетары

ЗАЧЫНЕНАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

Кошт нум.— 5 кап.

№ 263
АЎТОРАК
1
СЬНЕЖНЯ
1931 г.

Год выданьня XIV.

ВАЙСТРЭНЬНЕ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫХ СУПЯРЭЧНАСЬЦЯЙ У КІТАІ

ПАД НАЦІСКАМ ПАЗШ ЯПОНІЯ ПРЫПЫНІЛА НАСТУП НА ЦЗІНЬЧЖОУ

Цзяньцзіне, як і раней, напружанае становішча

...нія прыпыніла наступ на Цзіньчжоу

...раўленыя напярэдадні падмацаваньні з ...у зварочаны назад. Перад гэтым японскім ...ўраду была перададзена заява міністэр ...ежных сараў ПАЗШ з супярэчаньнем ...ь наступу на Цзіньчжоу. Лічыць таксама, ...начасова амэрыканскія банкіры прыгра... ...онскаму ўраду адмовай у выдачы пазы... ...якіх Японія зараз мае вялікую патрэбу. ...штo менавіта гэта «залатая пагроза» ...іла Японію спыніць наступ у бок унут... ...Кітая, дзе амэрыканскі капітал займае ...і пазыцыі і ня мае намеру дзяліць сваёй ...ы з Японіяй.

Цзяньцзіне працягваецца перастрэлка

...НХАЙ. У Цзяньцзінь адпраўлены стралко... ...пёрныя і марскія часткі з Манчжурыі і ... У горадзе працягваецца перастрэлка. ...і пагражаюць павесьці новы наступ на ...ую частку гораду, калі ўлады не раз... ...паліцыю, г. зн. адзіную ўзброеную сілу, ...казвае адпор узброеным бандам, што ...аюць па паказаньням японцаў, з мэтай ...эньня мясцовай улады.

...цовая ангельская газэта «Чайна прэс» ...ае, што японцы рашылі справацаваць ...ў Цзяньцзіне, каб апраўдаць свае ваенныя ...унутраным Кітаі і заняць Цзяньцзінь і ...

...ы замах японцаў на раёны, што захоп... ...шымі імпэрыялістымі, выклікае іх адпор. ...одзячая ў Цзяньцзіне амэрыканская газэ... ...рд чайна стар» піша: «Японія выканала ...бавязак парад дзяржавамі, даўшы кітай... ...бры вурок у Манчжурыі. Аднак, вурок ...ца надта сур'ёзным. Японія ўшла далё... ...прыдзецца ўступіць, калі яна не захо... ...ь выгнанай.

Гаміндан поўзае перад імпэрыялістымі

ПАЗШ І ЛІГА НАЦЫЙ—ГЭТА ВОЎК У АВЕЧЧАЙ СКУРЫ

Кампартыя Кітая вызваліць народ ад сваіх і чужых эксплёататараў

БЭРЛІН. Тут атрымана, з вялікім спазьненьнем, адозва ЦК КП Кітая з прычыны захопу Манчжурыі японскімі імпэрыялістымі. Адозва разаблачае Гаміндан, які поўзае перад імпэрыялістымі і спадзяецца на „справядлівасьць" Лігі нацыі, ПАЗШ. Спадзявацца на дапамогу Лігі нацый ці ПАЗШ,—гаварыцца ў адозве,—значыцца прападнесьці воўку авечую скуру для таго, каб ён накінуў яе на сябе і задраў авечак. Факты паказалі, што толькі СССР зьяўляецца прыхільнікам кітайскіх мас і што толькі КП Кітая можа вызваліць кітайскі народ.

Адозва заклікае рабочых, салдат, студэнтаў Кітая паўстаць супроць японскага імпэрыялізму, наладжваць сходы і дэманстрацыі. Узбройвайцеся,—заклікае КП,—заваюйце сабе свабоду слова, друку, сходаў і саюзаў! Скіньце здрадніцкі Гаміндан. Абараняйце адзіную антыімпэрыялістычную сілу ў Кітаі—кітайскія саветы.

Японцы забясьпечвалі зброяй генэрала Ма

БЭЙПІН. Справа аб забесьпячэньні зброяй генэрала Ма з Дайрэну прымае ўсё больш шырокі характар. Працягваюцца шматлікія арышты, як у Дайрэне, так і Мукдэне.

ДА ФІНІШУ ФІНЭСТАФЭТЫ ЗАСТАЛОСЯ 9 ДЗЁН

Выйсьці з абозу фінэстафэты—

СПРАВА ГОНАРУ ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЗРК ГАРБАРНІ, ЖЫЛЬЛЁВАЙ КААПЭРАЦЫІ І ФАБРЫКІ «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ»

Па-бальшавіцку вытрымаць баявы экзамін

...ньне фінпляну 4 га кварталу ...сьнежня зьяўляецца аднэй ...йшых і баявых задач. Спа... ...абавязковых плацяжоў, ...цыя сродкаў насельніцтва па ...чоткага і штодзённага кіраў ...боку партыйных, прафса... ...і гаспадарчых арганізацый, ...ба канстатаваць, што да гэ... ...у большасьць ніжэй пералічаных галінаў. Так, напрыклад, **ЗРК скурпінаў на 20-га лістапада плян пасенакапленьня 4-га кварталу выканаў толькі на 13,5 проц., уклады і ўзносы—на 10 проц; ЗРК «Дзьвіна»—на 33,9 проц., ЗРК акулярный—на 35 проц., ЦРК—на 36,4 проц., Інвалідная маспэрацыя—на 17,8 проц. жыльлёвая—на 39,6 проц. Рычагны падатак выкананы—на 34 проц., мэтавы—на 17,4 проц., асабістае страхаваньне—на 3,7 проц., добраахвотнае—на 45 проц. Заданьне па укладам у ашчадкасу па гораду выканана—на 40,5 проц., па вёсцы—на 2,1 проц.**

ГарФА, фінансава-банкаўскія работнікі апартуністычна адносіліся да гэтага пытаньня, не мабілізавалі масы на ліквідацыю стварыўшагася прарыву.

Адпаведныя арганізацыі павінны з усёй рашучасьцю ўдарыць па апартуністычных адносінах да мабілізацыі сродкаў. Застаўшыйся час да 10 га сьнежня трэба ператварыць у дні штурму па ліквідацыі прарываў па адстаючых вучастках фінпляну.

100-процантнае выкананьне фінпляну да 10-га сьнежня павінна зьявіцца баявым экзамінам для усёй партыйнай арганізацыі, кожнага камуніста паасобку. Прыцягненьнем да гэтай справы шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, бядняцкоў і серадняцкоў—аднаасобнікаў забясьпечым выкананьне дырэктывы партыі і ўраду.

Поўнасьцю выканаць узятыя на сябе абавязкі

...14-й гадавінай Кастрычніка ...фабрыкі «Сьцяг індустрыя... ...абавязаліся да 3 га лістапада ...асьцю падпісацца на пазыку ...чэ ня маюць пазыкі), выка... ...менш 75 процантаў квар... ...а пляну па ўкладках у ашч д... ...правесьці калектыўнае стра... ...е ўсіх рабочых фабрыкі.

...лася-б, што парткалектыў, ...ў КСМ і ФЗМК павінны бы... ...зённа кіраваць гэтай сара... ...ыць за тым, як выконваць ...ўзятыя на сябе абавязкі.

...ым, на адбыўшымся 25 га ...да пасяджэньні фабрычнага ...фінэстафэты высьветлілася, ...брычныя арганізацыі, дабіў... ...екаторых посьпехаў у ахопе ...к пазыкай (з 1200 непадпісаў ...падпіскай ахоплена 800 чал.) ...на лаўрах», пакінуўшы гэ... ...шпанію на самацёк.

...тага часу 400 рабочых яшчэ ...лены падпіскай на пазыку. ...ны плян па ўкладах у ...асы выкананы толькі на 17%. ...ньне па асобных цэхах ві... ...наступнай табліцы:

...цэхаў	Кантрольн. заданьне	Выканан.	
		Сума	%%
...чны . . .	3 500	821	23,4
...овы . . .	1 500	316	21,0
...ы	3.700	263	7,1
...ны . . .	1.000	335	33,5
...йны . . .	600	77	12,8
...стка . .	800	87	10,8
...льтэрыя .	800	—	—
...д	250	191	76,4
...ы з а м . .	12.150	2.090	17,2

Гэтыя лічбы яскрава паказваюць, што арганізацыі фабрыкі не давяралі важнасьці бесьперабойнага фінансаваньня «518» і «1040», важнасьці своечасовага і поўнага выкананьня фінпляну 4 га кварталу да 10-га сьнежня.

Растлумачальна-масавай работы сярод рабочых вакол выкананьня фінпляну па фабрыцы не вядзецца.

Старшыні цэхкомаў **Хвашчынскі** і **Арансон** спрабуюць перакласьці ўсю адказнасьць за зрыў фінработы на цэхавыя камсоды. Фабком абмяжоўваецца толькі пастановамі аб узмацненьні фінработы, але практычна ў гэтай справе ня ўдзельнічае.

Гэтак сама не аддае патрэбнай увагі гэтаму пытаньню і фабрычны друк. У выпушчаным 25 га лістапада чарговым нумары шматтыражкі няма ні слова аб прарывах у выкананьні фінпляну па фабрыцы.

Ліквідаваць у бліжэйшыя дні маючыйся фінансавы прарыў, поўнасьцю выканаць узятыя на сябе абавязкі—справа гонару ўсіх фабрычных арганізацый, усяго рабочага калектыву фабрыкі.

Нац.

Рэалізаваць фотоабавязацельствы

Мэтавыя накапленьні праз ашчадкасы займаюць значнае месца ў пляне мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Сьледам за выпускам вэлёабавязацельстваў, абавязацельстваў па швэйных машынах Саўнарком СССР дазволіў рэалізацыю фотоабавязацельстваў праз ашчадкасы.

Мэтавыя накапленьні зьяўляюцца ня толькі магутным сродкам фінансаваньня асобных галін сацыялістычнай прамысловасьці, але і даюць поўную магчымасьць усім працоўным шляхам унясеньня роўналежна невялікімі ўзносамі набыць каштоўныя рэчы.

Рэалізацыя фотоабавязацельстваў дае—з аднаго боку—на 77 млн. руб. для сацыялістычнай гаспадаркі, а з другога—400 тысяч пралетараў набываюць фотоапараты.

Фотоапарат у руках рабочага дасьць магчымасьць яшчэ шырэй разгарнуць паказ нашых дасягненьняў, ускрыць недахопы, дапаможа рабочаму ў барацьбе за аўладаньне тэхнікай і вытворчымі працэсамі, у барацьбе за перабудову быту.

Вось чаму ўсе фабрычна-завадзкія арганізацыі павінны павесьці энэргічную работу па рэалізацыі фотоабавязацельстваў сярод рабочых.

Аднак, фотоабавязацельствы ў Віцебску да 25 га лістапада рэалізаваны толькі на 1,8 проц.

Фабкомы, камсоды, грамадзкія інспэктары, камсамол, гурткі фізкультуры, фотогурткі пры клюбах павінны па-баявому разгарнуць працу па рэалізацыі фотоабавязацельстваў.

Лысенка.

АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ—ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА

МЭТАЛІСТЫ І АСЬВЕТНІКІ УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КОНКУРС

ТОЛЬКІ НА АСНОВЕ ШЫРОКА РАЗГОРНУТАЙ РАБОТЫ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ У БАРАЦЬБЕ З САМАЦЁКАМ У КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ ВЫРАШАНА ЗАДАЧА ЗАВЯРШЭНЬНЯ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ХТО ПАДМЯНЯЕ ГЭТУЮ АСНОЎНУЮ ЗАДАЧУ ПАДМЯНЯЙ ЗА ДУТЫМІ ПРОЦАНТАМІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, ТОЙ НЯ ТОЛЬКІ НЕ РАЗУМЕЕ АСНОЎНЫХ ЗАДАЧАЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ НА ДАННЫМ ЭТАПЕ, АЛЕ ІДЗЕ СУПРОЦЬ ПАРТЫІ

(З пастановы пленуму ЦК ВКП(б))

„МЭТПРОМАВЕЦ" УКЛЮЧЫЎСЯ Ў КОНКУРС

Дапаможам падшэфнаму сельсавету арганізацыйна замацаваць калгасы

Рэдкалегія шматтыражкі завода «Чырвоны мэталіст», разам з завадзкім актывам рабкораў, абгаварыўшы пытаньне аб усесаюзным конкурсе нізавых газэт саўгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна гаспадарчым замацаваньні калгасаў—уключаецца ў правядзеньне конкурсу, паставіўшы мэтай ажыцьцявіць наступныя задачы:

Па лініі шэфскай работы,—дапамагчы арганізацыі ў кожным калгасе і савгасе падшэфнага сельсавету выданьня трохдзённых, а дзе магчыма і штодзённых газэт, перавёўшы існуючыя таксама на трохдзённае і аднадзённае выданьне.

Правесьці спэцыялізаваныя нарады селькораў па сельсавету і калгасах, на якіх прапрацаваць рашэньні 2-га ўсебеларускага рабсельваенкораўскага зьезду і ўмовы конкурсу, абвешчанага «Правдой».

Праз савгасныя і калгасныя насьценгазэты і практычную работу селькораўскіх мас дамагчыся 100-процантнага выкананьня нарыхтовак, фінпляну і правільнага разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах.

З мэтай узмацненьня нарыхтовак склікаць сходы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў.

Дапамагчы рэдкалегіям насьценгазэт у арганізацыі сіламі селькораў, рэйдаў па пытаньні выкананьня нарыхтовак, фінпляну і правільнага разьмеркаваньня ўраджаю.

Перадаць [illegible] арганізацыйна-масавай [illegible] шматтыражкі «Мэтпромавец» рэдкалегіям і селькорам калгасаў падшэфнага сельсавету.

Сыстэматычна асьвятляць ход конкурсу на старонках газэты „Мэтпромавец".

Арганізаваць спаборніцтва паміж калгаснымі газэтамі на лепшае правядзеньне конкурсу і прэміяваць сельгасмашынамі рэдкалегіі тых калгасаў, якія дабіюцца лепшых вынікаў у справе арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня.

Перадаць калгасьнікам вопыт ударніцтва і сацспаборніцтва паміж рабочымі на заводзе з мэтай укараненьня сацыялістычных мэтадаў работы сярод калгасьнікаў.

Для наладжваньня дакладнага вучоту колькасьці і якасьці работы кожнага калгасьніка, для наладжваньня зьдзельшчыны ў калгасах, апрача высылаемай брыгады з 4-х рабкораў, накіраваць у падшэфны сельсавет аднаго рахункавода і працаўніка ТНБ.

Ва ўвесь час конкурсу высылаць у падшэфныя калгасы газэту „Мэтпромавец".

Рэдкалегія шматтыражкі і рабкоры завода «Чырвоны мэталіст» выклікаюць на сацспаборніцтва па лепшым удзеле ў конкурсе рэдкалегіі шматтыражак і рабкораў астатніх прадпрыемстваў гор. Віцебску.

Пастанова сакратарыяту гаркому КП(б)Б

аб правядзеньні конкурсу на лепшыя газэты калгасаў, савгасаў і МТС па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, абвешчанага ЦК партыі і газэтай „Правда"

Арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў зьвяртаецца ў цэнтральнай задачай партыі на дадзеным этапе, у справе пабудовы сацыялістычнай перабудовы вёскі. У зьвязку з гэтым [illegible] ЦК партыі—газэтай „Правда" усесаюзны конкурс [illegible] калгасаў і МТС, набывае вялізарнейшае значэньне. [illegible] лізацыі нізавога друку, селькораўскіх і калгасных мас [illegible] шэньне гэтай задачы.

Сакратарыят гаркому пастанаўляе:

Партыйным і прафсаюзным арганізацыям, забясьпечыць [illegible] адкладнае ўключэньне ў конкурс нізавых газэт і рабселькораў [illegible] мас, арганізаваўшы шырокую прапрацоўку ўмоў конкурсу [illegible] рабселькораў на сходах рабочых і калгасьнікаў.

Забясьпечыць пасылку прадпрыемствамі рабкораўскіх брыгад [illegible] у падшэфныя сельсаветы, калгасы і савгасы для аказаньня практычнай дапамогі у арганізацыі штодзённых і трохдзённых насьценгазэт, дапамогі нізавым газэтам у справе барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, за выкананьне плянаў усіх відаў нарыхтовак і асабліва збожжа. У часе правядзеньня конкурсу партыйным ячэйкам на мясцох зьвярнуць увагу на пытаньні хутчэйшай апрацоўкі ільну і канапель, на здачу (продаж) [illegible] ве добраякаснай таварнай прадукцыі ільновалакна і [illegible] гаючыся поўнага і своечасовага выкананьня плянаў.

Фракцыі гарпрафсавету, выходзячы з пастановы сакратарыяту ЦК КПСС, забясьпечыць неабходнымі сродкамі брыгады, пасылаемыя на вёску. Рэдакцыі газэты „Віцебскі пралетары" шырока асьвятляць [illegible] сваіх старонках ход конкурсу і правесьці па гэтым пытаньні [illegible] цыялізаваныя нарады рабселькораў паасобных галін прамысловасьці.

Абавязаць шматтыражкі асьвятляць на сваіх старонках [illegible] ту рабкораўскіх брыгад, накіраваных у падшэфныя сельсаветы, калгасы і савгасы.

Асьветнікі Менску і Гомельшчыны выкліканы на сацспаборніцтва

На аснове пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, КП(б)Б пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) дабіліся рашаючых перамог на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Зараз 50 процантаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў калгасы. Калгасьнік стаў цэнтральнай фігурай земляробства і сапраўднай апорай савецкай улады на вёсцы. Гэтыя посьпехі дасягнуты на аснове індустрыялізацыі нашай краіны, у рашучай і непрымірымай барацьбе супроць кулацтва і яго агентуры ў шэрагах партыі—правымі і «левымі» апартуністамі. Зараз перад партыяй, перад усёй пралетарскай грамадзкасьцю стаіць цэнтральная задача—арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, як асновы далейшай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Абвешчаны ЦО газэтай „Правды" конкурс нізавога друку савгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў мае надзвычайна вялікую палітычную важнасьць. Канфэрэнцыя асьветнікаў Віцебшчыны мабілізуе сябе на справу разгортваньня конкурсу і практычнае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых ЦО УсеКП(б) газэтай «Правда».

Асьветнікі Віцебшчыны бяруць на сябе наступныя практычныя абавязацельствы:

1. Кожны асьветнік пад кіраўніцтвам партыйных ячэек, прымае самы актыўны ўдзел у шырокай папулярызацыі задач конкурсу сярод калгасьнікаў, рабочых савгасаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

2. Распрацаваць пастанову лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на практычную дапамогу саўгасам і калгасам ў ажыцьцяўленьні пастаноў пленума ЦК КП(б)Б і адозвы ЦК КП(б)Б і СНК аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

3. Асабістым удзелам (падача матар'ялу і дапамога ў тэхнічным афармленьні) дапамагчы ў арганізацыі і рэгулярным выпуску насьценных газэт, па калгасах і савгасах.

4. Праз цэнтральны і мясцовы друк прыняць удзел у шырокім асьвятленьні вопыту барацьбы калгасаў за іх арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне.

5. Прыняць удзел у рэйдах, арганізуемых рэдкалегіямі насьценных газэт і селькорамі, па праверцы ўвядзеньня зьдзельшчыны, разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў па колькасьці і якасьці працы, выкананьню плянаў загатовак, падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы і інш. мерапрыемствах.

6. Канфэрэнцыя лічыць неабходным уключыць у праграму работы прафгурткоў пытаньне распрацоўкі дырэктыў партыі і пастаноў 2-га Усебеларускага зьезду рабсельваенкораў па пытаньнях перабудовы нізавога друку і рабселькораўскага руху, папулярызуючы гэтыя рашэньні сярод шырокіх мас калгасьнікаў і рабочых савгасаў.

7. Кожны асьветнік, працуючы на вёсцы, бярэ на сябе абавязак разгарнуць работу па ўкараненьні агратэхнікі ў калгасах і савгасах, арганізуючы гурткі і аказваючы ім дапамогу ў іх практычнай рабоце.

8. Асьветнікі гор. Віцебску бяруць на сябе абавязак наладзіць выезд брыгад у падшэфныя калгасы і савгасы па аказаньні практычнай дапамогі ў разгортваньні і правядзеньні конкурсу.

9. Асьветнікі Віцебшчыны выклікаюць на сацспаборніцтва па правядзеньні конкурсу, абвешчанага газэтай «Правда», асьветнікаў Гомельскага і Менскага раёнаў. Арбітрам абіраем газэты: «Зьвязда», «Віцебскі пралетары» і „Палеская праўда».

10. На чарговай канфэрэнцыі асьветнікаў заслухаць даклад аб праробленай рабоце па выкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў.

Прэзыдыум канфэрэнцыі асьветнікаў Віцебскага раёну.

Правільнай расстаноўкай рабочай сілы у калгасах

забясьпечым ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб арганізацыі адыходніцтва

Камсомол творам да арганізацыі адыходніцтва

Вырашэньне задач забясьпячэньня прамысловасьці рабочай сілай зьяўляецца адней з рашаючых умоў своечасовага пуску «518» і пасьпяховай падрыхтоўкі да чацьвёртага заключнага году пяцігодкі. Вялізарная роля ў вырашэньні гэтай задачы ўскладаецца на камсамольскія арганізацыі. Аднак, большасьць камсамольскіх арганізацый яшчэ па баявому не прыступілі да ажыцьцяўленьня паказаньняў т. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы і змаганьні з грубымі скажэньнямі на практыцы заключэньня дагавароў.

Пастанова ЦК УсеЛКСМ ад 9 га кастрычніка высоўвае канкрэтныя задачы, над ажыцьцяўленьнем якіх зараз павінны работаць камсамольскія арганізацыі. Гэта пастанова ставіць у цэнтр увагі камсамолу апэрацыйную, масава растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, вытворчую і культурна-бытавую дапамогу калгасам. Каб выканаць гэтую пастанову, трэба габінэтную практыку па заключэньні дагавароў замяніць жывой і ўпартай работай, выездам у раёны, стварэньнем спэцыяльных вярбовачных камсамольскіх брыгад, устанаўленьнем сталай шэфскай сувязі з калгасамі і калгасьнікамі. Каб выканаць гэтую пастанову, камсамольскія арганізацыі павінны ўзяць пад неаслабны кантроль работу гаспадарнікаў па арганізацыі адыходніцтва і павесьці рашучую барацьбу са скажэньнямі ў заключэньні дагавароў.

Надта часта не зварочваецца ніякай увагі на якасьць калгасьнікаў, што вярбуюцца, на падбор сапраўды лепшых, сьвядомых і перадавых калгасьнікаў. Былі выпадкі, калі гаспадарчыя арганізацыі вербавалі настаўнікаў, рахункаводаў і інш. (Макеёўка), а сьлесары і электрыкі заставаліся на звычайнай калгаснай рабоце. З такімі брыдкасьцямі трэба пакончыць.

Адначасова камсамольскія арганізацыі павінны разгарнуць работу па замацаваньні адыходнікаў на вытворчасьць, на барацьбе з цякучасьцю. Трэба ня толькі вербаваць, але і стварыць для завербаваных здавальняючыя бытавыя ўмовы. **Барацьба за чыстату барака, за мыюб, аптэчку, пральню, сталовую, супроць п'янства і гульні ў карты**—павінна легчы ў аснову работы камсамолу па замацаваньні адыходнікаў.

Камсамольцы прадпрыемстваў, якія вярбуюць, павінны арганізаваць вытворчае навучаньне адыходнікаў, ствараючы для іх соэцыяльныя курсы і прымацоўваючы адыходнікаў да кадравых рабочых. Другой баявой задачай вярбуючых прадпрыемстваў заяўляецца барацьба за вызваленьне з калгасаў лішняй рабочай сілы, на падставе ўкараненьня зьдзельшчыны ў калгасах, палепшэньня вучоту, поўнага выкарыстоўваньня машын, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі. Праводзячы шырокую культурна-масавую работу сярод калгасьнікаў, арганізуючы вытворчыя нарады з імі, дапамагаючы ім аўладаць агратэхнікай і пастаноўкай вучоту—камсамольцы вырашаць гэтую задачу і дадуць прамысловасьці новыя тысячы адыходнікаў.

Паміж камсамольскімі арганізацыямі прадпрыемстваў і камсамольцамі калгасаў, заключыўшых дагаворы на пастаўку рабочай сілы, павінна ўстанавіцца цесная сталая сувязь, накіраваная на далейшае разьвіцьцё адыходніцтва і замацаваньне адыходнікаў на вытворчасьці.

На падставе пастановы ЦК УсеЛКСМ камсамол павінен дабіцца рашаючых вынікаў у правядзеньні ў жыцьцё лёзунгу т. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы і рушыць новыя мільённыя папаўненьні рабочых у сацыялістычную прамысловасьць.

Г. Сіляніскі.

Самацёку ня можа быць месца

Арганізавана пасылаць адыходнікаў у прамысловасьць

Арганізаваны набор рабочае сілы для сацыялістычнай прамысловасьці м е надта важнае значэньне. Гэтага ня ўлічвае праўленьне калгасу „Бяроза".

У калгасе маецца лішак рабочай сілы, праўленьне калгасу дапушчае выпадкі самачыннага ўходу калгасьнікаў у горад. За апошні час пайшло з калгасу ў горад 82 чалавека, частка з якіх працуе на прадпрыемствах, а частка ходзіць бяз усялякай працы.

Праўленьне калгасу своечасова не занялося пытаньнем арганізацыі адыходніцтва, ня ўдарыла па самацёку.

Зараз, у сувязі з праводзімым вытворча-калгасным паходам камсамольскай арганізацыяй, ячэйцы КСМ пры калгасе «Бяроза» неабходна будзе заняцца пытаньнем арганізаванай пасылкі на вытворчасьць калгасьнікаў.

Жук.

Калгас „Цяжкая індустрыя" дае адыходнікаў прамысловасьці

Дагэтуль у калгасе «Цяжкая індустрыя» рабочая сіла самацёкам ішла на вытворчасьць, што адбівалася на працы калгасу.

Камсамольская ячэйка першая ўзялася за арганізацыю адыходніцтва. Заключана ўмова з біофабрыкай, куды пасланы тры калгасьнікі і на лесараспрацоўкі два.

Калгас «Цяжкая індустрыя» і надалей будзе пасылаць адыходнікаў на вытворчасьць. Укараненьне зьдзельшчыны, правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў дасьць магчыма мець калгасу ажыцьцявіць сталінскі заклік адыходнікаў у сацыялістычную прамысловасьць.

Г. В.

Ударыць па шкоднай дзейнасьці Міхеева

У той час, як многія калгасы даюць рабочую сілу сацыялістычнай прамысловасьці, на справе ажыцьцяўляюць сталінскі заклік калгасьнікаў у вытворчасьць, калгас імя Ланцуцкага, Рудніцкага сельсавету, гэтага ня выконвае. Між тым, у калгасе ёсьць вольная рабочая сіла, якая з посьпехам магла быць скарыстана на вытворчасьці.

Для таго, каб даць якую небудзь работу калгасьнікам, старшыня праўленьня Міхееў парашыў вытвараць ільнопражу саматужным спосабам. Міхееў не жадае выканаць дырэктывы аб пасылцы калгасьнікаў на вытворчасьць і—з л а ч ы н н а нядбайна адносіцца да забясьпечаньня сацыялістычнай прамысловасьці сыравінай.

Па гэткіх праявах райкалгасаюз павінен рашуча ўдарыць.

Калгасьнік.

Нарада вясковага партактыву

4 сьнежня, а 12 гадз. дню, у клюбе гаркому КП(б)Б склікаецца **шырокая нарада вясковага партактыву** (сэкратароў сельячэек, старшынь с/с, кіраўнікоў саўгасаў, каапгасаў і калгасаў—камуністых) па пытаньнях: **аб нывёлагадоўлі і месячніку апрацоўцы і нарыхтовак лёну.**

Яўка вышэйпералічаных абавязкова.

Гарком КП(б)Б

ГЭРОІ ПЯЦІГОДКІ УЗНАГАРОДЖАНЫ

Узнагародзе некаторых работнікаў швэйнай прамысловасьці ордэнам Працоўнага Чырвонага сьцягу БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР

...з выкананьнем швэйнай прамысловасьцю БССР ...тры гады — За сацыялістычную рацыяналізацыю ...цьцю вытворчых працэсаў, разгортваньне сацспаборніцтва і праўлекую самаахвярную ўдарную ра... Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ...маўляе:

Узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага сьцягу — тт.:

Варкіна Ю. М. (нам. дырэктара ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі"),

Будніцкага (рабочы ф-кі „Камінтэрн"),

Калабкова І. І. (дырэктар ф-кі „Кастрычнік"),

Рохкінда Б. Ш (рабочы ф-кі „Кастрычнік", зараз сакратар партколектыву ф-кі),

Эрэнбурга Г. З. (нам. кіраўніка Белшвэйаб'яднаньня),

Міткевіч (работніца фабрыкі „Камінтэрн"),

Чартову Р. (работніца ф-кі „Кастрычнік"),

Зайцаву (работніца ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі").

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **Д. Чарвяконў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гніляневіч.**

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР узьняў ходайніцтва перад прэзыдыумам ЦВК Саюзу аб узнагародзе ордэнамі Чырвонага Працоўнага сьцягу СССР работнікаў швэйнай прамысловасьці БССР тт.:

Баскіна А. Е (б. кіраўнік Белшвэйаб'яднаньня), **Асіпоўскую Б. Н.** (работніца ф-кі «Сьцяг індустрыялізацыі») і **Гарэліка Х. Б** (рабочы ф-кі «Кастрычнік").

...аду ...Чыр ...інш.). ...льская ар... ...ў сваіх шэ... ...яч навічкоў, ...штодзённая да... ...ўніцтва. З дачы ...калектываў і ячэек ...асаблівую ўвагу ...льскай арганізацыі па ...ньню ўсіх навічкоў у шэ... ...ударніцтва і іх палітычна... ...выхаваньню, адначасова пра... ...дзячы далейшую работу па ...росту арганізацыі, выконваючы ...дырэктыву аб 100-процантным ...ахопе рабочай моладзі камсамолам.

У кіраўніцтве камсамольскай арганізацыі патрэбен рашучы пералом. Гэты пералом павінна даць перавыбор ячэйкі кампанія партарганізацый.

Цырлін З.

...ма... ...наведы... ...ы кам... ...апошнім ...орыя пар... ...і ячэйкі па ...не заслухоў...

Часьць ячэек швэйнага волату БЕЗ ПАРТКІРАЎНІЦТВА

...оку партыйных ячэек фаб... «Сьцяг індустрыялізацыі» ...аль няма ніякай дапамогі і кіраўніцтва камсамольскімі ячэйкамі. Ня гледзячы на тое, што партыйны камітэт неаднаразова ставіў пытаньне перад цэхавымі ячэйкамі аб неабходнасьці ўзмацненьня парткіраўніцтва, але апошнія зусім не цікавяцца камсамольскай працай.

Праўда, маюцца некаторыя партыйныя ячэйкі, якія вылучылі партпрымацаваных (ячэйкі 8-й і 10-й істужкі бручнага цэху і некаторыя ячэйкі пінжачнага цэху), але астатнія ячэйкі зусім забылі аб тым, што камсамолу патрэбна штодзённая дапамога і кіраўніцтва. Ячэйка КСМ тэхчасткі нават ня мае партпрымацаванага і зразумела, што ў выніку адсутнічаньня парткіраўніцтва работа ячэйкі кульгае. Маюцца факты, калі ў партыю прымаюць камсамольцаў габінэтным парадкам (пінжачны і ўцюжны цэхі).

Партыйны камітэт не забясьпечыў праверку выкананьня сваіх дырэктыў, якія дадзены нізавым ячэйкам, у галіне парткіраўніцтва камсамолам.

Неабходна зараз-жа прыняць адпаведныя меры з тым, каб партыйнае кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй на фабрыцы было б узмацнёна.

Навум Абезгаўз.

Слова за гаркомам КСМ

Камсамольскі калектыў пры Старасельскім сельсавеце з прычыны недастатковага кіраўніцтва партыйнай ячэйкі і гаркому камсамолу працуе зусім слаба.

Росту калектыву зусім няма. Палітвыхаваньне камсамольцаў не наладжана. У часе ўборачнай кампаніі паасобныя камсамольцы ня былі ў авангардзе ў справе ўнядрэньня ў работу бальшавіцкіх форм працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва і не паказвалі ўдарных тэмпаў у сваёй рабоце.

Работу калектыву КСМ Старасельскага сельсавету патрэбна неадкладна наладзіць.

Узоры Алесь, Пламенны.

„Стварым сваю ўласную вытворча-тэхнічную інтэлігэнцыю" (І Сталін)

На заводзе „Камінтэрн" і панчошнай

ІГНАРУЮЦЦА ПАКАЗАНЬНІ ПРАВАДЫРА АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ СВАЕЙ УЛАСНАЙ ВЫТВОРЧА-ТЭХНІЧНАЙ ІНТЭЛІГЭНЦЫІ

БЮРО ІТС ГЭТЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ АБАВЯЗАНЫ РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ ПА ПРАСОЎВАНЬНІ ТЭХНІКІ У МАСЫ

Бюро ІТС панчошнай фабрыкі бязьдзейнічала

На панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін 30 членаў інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі, з якіх толькі 5 маюць спэцыяльную адукацыю, астатнія — рабочыя-вылучэнцы. Недахоп у тэхнічных кадрах адчуваецца ў штодзённай рабоце фабрыкі. Цэхі ня маюць дастатковага тэхнічнага кіраўніцтва, што, бязумоўна, адбіваецца на выкананьні прамфінпляну.

Адначасова з перавыборамі прафорганаў на фабрыцы праходзяць перавыбары бюро ІТС. Трэба адзначыць, што бюро не адчувалася ў рабоце фабрыкі. ІТС не праявіла амаль ніякай ініцыятывы ў справе падвышэньня тэхнічнага ўзроўня работніц. Тэхнічныя гурткі не працуюць. Фабком і адміністрацыя фабрыкі не забясьпечылі ім нармальнай работы. Гурткі не забясьпечаны памяшканьнем і абсталяваньнем. Арганізаваныя курсы ФЗТК не забясьпечаны выкладчыкамі і памяшканьнем. У зьвязку з тым, што праграма курсаў вельмі напружана, бо за кароткі тэрмін неабходна выпусьціць кадры тэхнікаў, на справу стварэньня належных умоў работы курсаў павінна быць зьвернута максымум увагі.

У зьвязку з падрыхтоўкай да 4-га заключнага году пяцігодкі ўсе члены ІТС павінны прыняць актыўны ўдзел у абгаварэньні тэхнічных мерапрыемстваў для пасьпяховага выкананьня вялікіх плянаў 1932 году.

Бюро ІТС павінна канкрэтна дапамагчы вытворчаму аддзелу фабрыкі. У зьвязку з тым, што значная большасьць членаў ІТС ня мае спэцыяльнай адукацыі, неабходна зараз-жа арганізаваць гурткі па падвышэньні тэарытычных ведаў, разгарнуць сетку завочнага навучаньня, выканаць пастанову аб арганізацыі гуртка па вывучэньні нямецкай мовы і г. д. Толькі на падставе шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўсе члены ІТС будуць уцягнуты ў работу, будуць змагацца за выкананьне тых задач, якія перад імі пастаўлены.

Эпштэйн.

Пакончыць з апартуністычнымі адносінамі да пэдрыхтоўкі тэхнічных кіраўнікоў з рабочых

Завод «Камінтэрн» у 1932 годзе, паводле пляну, павінен перайсьці на бесперапынную працу і трохзьменку (за сьлясарнаму цэху магчыма на 2 зьмены). Колькасьці рабочых павялічыцца. Гэта патрымушае ўсе арганізацыі заводу зараз-жа прыняць меры па падрыхтоўцы да 4-га году пяцігодкі, каб уся работа з 1 га студзеня была пабудавана на прынцыпах чоткага гаспадарчага разрахунку цэхаў і пераводу паасобных брыгад на гаспадарчы разрахунак. Ужо зараз афармляецца некалькі гаспадарча разрахунковых брыгад.

Увядзеньне чоткай сапраўднай плянавасьці, жорсткага гаспадарчага разрахунку, уцягненьне новых рабочых, пашырэньне вытворчасьці ні ў якім разе ня можа ажыцьцяўляцца старымі мэтадамі працы. Патрабуецца амаль што падвоеная колькасьць адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу. Заводу няма адкуль апошніх чакаць, а іх трэба рыхтаваць зараз-жа. На заводзе маюцца кваліфікаваныя кадры з вялікім вытворчым стажам. Але недастаткова мець вытворчы вопыт, трэба яшчэ мець і тэхнічныя, нават спэцыяльныя, веды для ажыцьцяўленьня сапраўднага тэхнічнага кіраўніцтва працай па добраякаснаму рамонту па ўсяму канвэеру тэхналёгічных працэсаў, пачынаючы з прыёмкі заказаў, іх калькуляцыі, каляндарнага пуску ў ход выпрацоўкі дэталяў па заказах і г. д.

Пры старых маштабах працы заводу толькі 1½—2 гады таму назад усю гэтую працу вялі 2—3 таварышы. Зараз апарат хоць некалькі і пашырыўся, праца наладжваецца, маецца інжынэр, тры тэхнікі, але астатнія 12—13 таварышоў, маючыя непасрэдныя адносіны да кіраўніцтва вытворчасьцю і цэхамі, тэхнічна не падрыхтаваны.

Трэба загадзя рыхтаваць кіруючы склад, не адрываючы сілы ад вытворчасьці, а такія магчымасьці ёсьць, трэба іх толькі скарыстаць. Пры палітэхнікуме адкрыліся 13 месячныя курсы па падрыхтоўцы тэхнікаў. Заводу дадзена заданьне паслаць людзей на курсы, але завод нікога не паслаў. Замест таго, каб быць за большую колькасьць месц для тэхнічнага ўбраеньня практыкаў з адміністрацыйна тэхнічнага персаналу і для падрыхтоўкі новых, кіраўніцтва не паслала ні воднага чалавека.

Тав. **Нецьцяў** — былы загадчык лідзейнага цэху ў сучасны момант прыёмшчык заказаў, падаў заяву аб пасылцы на курсы, але яго не паслалі. Чаму? **Цісенгаўзена** — кальку лятара — не пасылаюць. «Дазволеныя» **Булах і Рыхлеўскі** яшчэ таксама не накіраваны, а т. Карташоў — майстра сьлясарнага, Усман — ліцейнага цэху, Грушын — мадэльнага, з кацельнага, вугагеннага і іншых цэхаў — лепшыя ўдарнікі не пасылаюцца на гэтыя курсы. Месцы на курсах яшчэ не запоўнены.

Трэба безадкладна выправіць гэтую недапушчальную памылку. Пасыўнасьці і недабачлівасьці завадзкога трыкутніку павінен быць пакладзены канец.

Л.

РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКУЮ РАБОТУ

НА СЛУЖБУ ПАСЬПЯХОВАМУ ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНАЎ ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ

Ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў на ф-цы „Дзьвіна" дае вялікі эканамічны эфект

Бюро рацыяналізацыі фабрыкі «Дзьвіна» праводзіць зараз вопыт — устаноўку ватэрных утулак з унутранай адваротнай разьбы ходу верацён. Атрыманы добрыя вынікі: эканомія масла пры рабоце 74 вацераў у 20 тыс. кілёграм і на рабсіле 6 тыс. руб. у год, з прычыны таго, што змазку трэба будзе вытвараць толькі адзін раз у тры зьмены.

Таксама праводзіцца ўстанаўленьне мэханічнага тормазу для прыпыненьня ватэрных верацён, што камісіяй і дырэкцыяй праверана і ўхвалена. У выніку гэтага ўдасканаленьня значна паляпшаецца праца ватэршчыц, таксама і зьёмшчыц. Акрамя таго, памяншаецца лікняшчасных выпадкаў, асабліва пры дыфэрыянцаванай працы.

Па лентачнаму цэху неабходна ў бліжэйшы час, паводле праэкту т. Чысьцякова, наладзіць вопыт электрычнага спіненьня лентачнай машыны пабрыве лены. Гэта дасьць магчымасьць палепшыць якасьць паўфабрыкату, зьменшацца пропускі, ці яны зусім ліквідуцца, а ў зьвязку з гэтым паменшыцца і колькасьць браку. Пры правядзеньні гэтага мерапрыемства адна работніца-лентачніца абслугоўвае замест аднэй — дзьве машыны. Уже гэта дасьць эканомію па лентачнаму цэху менш, як 75—100 тыс. руб. у год.

Б. Р.

Выканалі 50 процантаў пляну рацыяналізацыі

Аб брыдкіх адносінах да рацыяналізатарскай работы на шэрагу прадпрыемстваў мы неаднаразова пісалі. Пісалі і аб акулярнай фабрыцы, дзе на працягу аднаго году мянялі некалькі разоў працаўнікоў бюро рацыяналізацыі. Таварыш, які працаваў раней рацыяналізатарам, быў пасланы спэцыяльна на курсы рацыяналізатараў, але па сканчэньні курсаў яго забралі загадчыкам мэханічнага цэха. У выніку такіх адносін да бюро рацыяналізацыі, **мерапрыемствы, намечаныя па пляну рацыяналізацыі на 1931 год, выкананы на 50 проц.** Не выконваецца шэраг каштоўнейшых мерапрыемстваў, як-та: скарыстаньне цэлюлёйдных адходаў шляхам пераапрацоўкі іх ацытонам, устанаўленьне стандартаў. Пасьля рэзкі аднаго разьмеру, без належных зьмен, ражуць другі, што значна пагаршае якасьць прадукцыі.

Нягледзячы на ўсё гэта, ніякіх мер па ўкамплектаваньні аддзела рацыяналізацыі належнымі працаўнікамі і наогул для стварэньня ўмоў для работы бюро ня прымаецца. У бюро рацыяналізацыі павінна працаваць чатыры чалавекі, але працуе фактычна адзін. На прадстаўленьне трох месцаў на курсы рацыяналізатараў у Белметальаб'яднаньне накіраваны толькі адзін чалавек.

Акулярная фабрыка мае вялікую колькасьць працэсаў, якія магчыма рацыяналізаваць і праз гэта дасягнуць вялікай эканоміі і значнага палепшаньня якасьці прадукцыі.

Белметальаб'яднаньне і РСІ павінны зацікавіцца становішчам рацыяналізатарскай работы на акулярнай фабрыцы і выявіць вінаватых у зрыве выкананьня пляну 1931 г.

Неабходна зараз-жа прыступіць да распрацоўкі плянаў рацыяналізацыі на 1932 год, шырока абгаварыць яго сярод рабочых ф-кі.

П.

Неабходна склікаць 2-ю агульна-гарадзкую канфэрэнцыю вынаходцаў і рацыяналізатараў

У канцы чэрвеня адбылася першая агульна-гарадзкая канфэрэнцыя вынаходцаў і рацыяналізатараў. Канфэрэнцыя, якая праходзіла пры выключнай актыўнасьці дэлегатаў, прыняла шэраг рашэньняў аб пастаноўцы работы з рацыяналізатарамі і вынаходцамі на прадпрыемствах.

Канфэрэнцыя адзначыла неабходнасьць арганізацыі эксперыментальнай майстэрні ў горадзе.

На апошній канфэрэнцыі ІТР па справаздачы гарМБІТ амаль нічога ня было сказана аб тым, што гарМБІТ было зроблена па выкананьні пастаноў чэрвеньскай канфэрэнцыі рацыяналізатараў і вынаходцаў. Маючыяся пастановы аб арганізацыі на кожным прадпрыемстве ячэек вынаходцаў да гэтага часу не выкананы.

Па вопыту перадавых прадпрыемстваў Масквы і Ленінграду арганізаваны ўдарныя групы практыкаў, выканаўцаў, на дабраахвотных пачатках па рэалізацыі паасобных знаходзтваў далі добрыя вынікі. Таксама трэба арганізаваць ударныя брыгады. На дапамогу абходна прыцягнуць студэнтаў тэхнікуму і іншых навучальных тэхнічных устаноў.

ГарМБІТ і гарпрафсавет павінны неадкладна заняцца гэтым пытаньнем. Неабходна склікаць другую канфэрэнцыю вынаходцаў пад агульнай праверкі выкананьня рашэньняў першай канфэрэнцыі і намячэньня канкрэтных мерапрыемстваў па далейшай работы ячэек вынаходцаў на прадпрыемствах.

М. А.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ. М. ВЭЛІКСОН.

Узорны цэх харчаваньня

Яшчэ не пасьпеў прарэзьлівы крык гудка сыгналізаваць аб наступленьні абедзенага часу, а людзкі паток ужо бітком запоўніў калідор і заводзкі завулак, ствараючы доўгі «хвост» — гэта рабочыя мэталісты стаяць у чарзе за абедам. «Хвост» робіцца ўсё даўжэй і даўжэй за лік новых людзей, бягучых на штурм... абедаў.

— Гэй ты, што без чаргі суешся. А-ль пастаяць ня можаш.

— Вось і ня магу. Членскія ўзносы, ты штоль за мяне будзеш зьбіраць, ды мне яшчэ трэба «Мэтпромавец» распаўсюджыць у цэху. Вось і пасьпявай.

— Усё роўна пастаіш.

Так было. Чарга за абедзенымі талёнамі, чарга за атрыманьнем абедаў, змаганьне за месца, чарга, чарга і чарга...

А ў цэху ля варштатаў, ля пыльных наждачных каменьняў групы, групачкі даядалі сваю страву. Гэта больш сьвядомыя, якія сьвядома пазбаўлялі сябе гарачага абеду, абы ня мучыцца, абы не стаяць у чарзе.

Сёньня гэтага няма... «Чырвоны Мэталіст» дабіўся вытворчай перамогі. У гэтым бясспрэчны заслугі яго цэху — сталоўкі.

— Заходзьце, калі ласка, у цэх. Праз 10 хвілін абедзенны перапынак — зварочваецца да нас рабочы-ударнік, вылучаны на адказную пасаду загадчыкам сталоўкі — т Якімаў.

Першае, што кідаецца ў вочы — гэта абсалютная чыстата і парадак. Першая страва яшчэ да прыходу рабочых расстаўлена па сталох. Чыстыя сталы, кветкі, графіны з вадой дадаюць сталоўцы ўютны і прыемны выгляд. Яшчэ не пасьпелі скончыць агляд кухні, але ўпаўне пераканаўшыся, што кухня таксама знаходзіцца на ўзорным парадку, як загудзеў гудок і рабочыя, здаючы абедзенныя талёны, займаюць свае месцы. 240 чалавек абедаюць, але гэтага зусім ня чутна. У сталовай пануе абсалютная цішыня і належны парадак. Толькі і бачыш, як афіцыянткі ў белых і чыстых халатах бягуць туды і сюды, абслугоўваюць рабочых і трэба адзначыць абслугоўваюць добра.

— А хто гэта ў вас шагае па сталоўцы. Мы яго таксама бачылі і на кухні. Гэта мусіць старэйшы афіцыянт?

— Не, гэта наш урач Ёсьць і яшчэ адзін. Гэта яны ўзялі нашу сталоўку пад свой мэдычны кантроль.

Не пасьпеў загадчык нам адказаць на наша запытаньне, як мы ўбачылі, што ў сталоўцы ўжо нікога няма.

Гадзіннікі заўсёды гавораць праўду. Абед працягваўся 15 мінут.

— Вы зьдзіўляецеся, што абед працягваецца не больш 15 мінут. Нічога дзіўнага тут няма, і пакуль мы даядалі нашу страву (а абед трэба сказаць сваёй якасьцю поўнасьцю адпавядае патрабаваньням рабочых) загадчык сталоўкі растлумачыў нам, як яны дабіліся перамогі ў цэху харчаваньня.

— Тут нічога дзіўнага няма. Абедзенныя талёны рабочыя атрымліваюць у сябе ў цэху. Кожны цэх мае свой сталы абедзены час. У першую зьмену мы абслугоўваем 1400 раб. У дадатак мы яшчэ штодзённа адпускаем 60 дыэтычных абедаў. Пасудай сталоўка цалкам забясьпечана. Другую і трэцьцюю зьмены мы таксама поўнасьцю забясьпечваем абедамі. Апрача гэтага маецца буфэт, які абслугоўвае ўсе зьмены. Якасьць абедаў упаўне здавальняючая. Мы маем сталыя дагавары з калгасамі, па якіх яны забясьпечваюць нас мясам і іншымі прадуктамі. Бульбай і іншай гароднінай сталоўка поўнасьцю забясьпечана на зімовы час. Зараз, як вы самі бачылі, мы будуем сьвінарнік на 200 сьвіней.

Усе гэтыя мерапрыемствы даюць нам магчымасьць палепшыць якасьць работы сталоўкі. За апошні час мы дабіліся яшчэ аднэй перамогі — 24 дні ў месяц рабочыя атрымліваюць мясныя абеды.

Загадчык сталоўкі расказаў нам і аб недахопах. На гаспадарчы разрахунак сталоўка пераведзена. Мае свой паасобны рахунак у банку, але сталага вучоту яшчэ няма. Вельмі адстае бухгальтэрыя. Са зьдзельшчынай таксама яшчэ ня ўсё добра. На наша запатрабаваньне аб устаноўцы норм і расцэнак саюз нарахаў адказвае маўчаньнем. Праўда, штат абслугоўваючага пэрсаналу за апошні час зьменшыўся на 25 чал., але перавод на зьдзельшчыну даў-бы нам яшчэ больш эканамічны эфэкт. Але мы зьнішчым і гэтыя недахопы, заканчвае сваё тлумачэньне загадчык сталоўкі.

Гэта ня пустыя словы. Гэта праверяныя факты. Сталоўка «Чырвонага мэталіста», нягледзячы на яшчэ маючыйся рад недахоп ў, ператварылася ў сапраўдны цэх харчаваньня. На жаль, такіх цэхаў харчаваньня ў Віцебску больш няма. Між тым ЗРК, ЦРК і іншыя рабочыя сталоўкі нават ня імкнуцца выкарыстаць мэтады работы сталоўкі «Чырвонага мэталіста». Ім трэба яшчэ раз напомніць, што рабочы «... патрабуе забясьпячэньня ўсіх сваіх матэрыяльных і культурных патрэб і мы павінны выканаць гэта яго патрабаваньне. Не забывайце, што мы самі выступаем цяпер са сьвядомымі патрабаваньнямі да рабочага, — патрабуем ад яго працоўнай дысцыпліны, напружанай работы, спаборніцтва, ударніцтва. Не забывайце, што армадная большасьць рабочых прыняла гэтыя патрабаваньні савецкай улады з вялікімі ўзрушэньнямі і выконвае іх гэройскі. Ня зьдзіўляйцеся таму, што ажыцьцяўляючы патрабаваньні савецкай улады, рабочыя будуць у сваю чаргу трэбаваць ад яе выкананьня яе абавязацельстваў па далейшым паляпшэньні матэрыяльнага і культурнага становішча рабочых». (Сталін).

Працу груп садзейнічаньня РСІ — на належную вышыню

Разгарнуць працу груп садзейнічаньня РСІ на прадпрыемствах

Па шэрагу буйнейшых прадпрыемстваў гораду на працягу апошніх двух месяцаў арганізаваны гурткі садзейнічаньня РСІ. Гэтыя маладыя арганізацыі, закліканыя змагацца з усялякімі недахопамі прадпрыемстваў і выяўляць усе хваробныя бакі працы і канкрэтных вінаўнікаў, перашкаджаючых у выкананьні прамфінпляну, ужо на першых крокаў сваёй працы маюць цэлы шэраг дасягненьняў.

Праведзеная 10 га лістапада нарада груп садзейнічаньня РСІ паказала, што значная частка іх па ўдарнаму разгарнула работу на мясцох, рашуча выяўляючы хваробныя зьявішчы на паасобных вучастках прадпрыемства і прымаючы захады да зьнішчэньня іх.

Так, група **садзейнічаньня заводу «Чырвоны мэталіст»** выявіла **дрэннае абслугоўваньне начных зьмен, нездавальняючае скалькстаньне матар'ялаў, слабае кіраўніцтва начнымі зьменамі.** Дадзены канкрэтныя прапановы па паляпшэньню працы.

На акулярнай фабрыцы група выявіла шэраг хворых момантаў: **слабая барацьба з бракамі і прастоямі, нерацыянальна скарыстоўваецца матар'ял, абсталяваньне і рабочая сіла.** Пасьля абсьледваньня дадзены паказаньні аб палепшаньні вытворчай працы.

Дзякуючы групе садзейнічаньня РСІ, на таварным двары ст. Віцебск папяраджана шмат прастояў вагонаў і лайф з грузам.

Група садзейнічаньня РСІ вагоннай майстэрні МБВ чыгункі дабілася забясьпячэньня майстэрні **добраякасным** вугалем, у выніку чаго палепшылася якасьць рамонту.

Побач з дадатнымі момантамі ў рабоце груп маюцца недахопы, якія ў далейшым павінны быць зьнішчаны („Сьцяг індустрыялізацыі", скурзавод, лесзавод № 13 і інш.). Яны дагэтуль не ўявілі сабе важнасьці сваіх задач. У некаторых выпадках групы займаюцца дробнымі пытаньнямі, выпускаючы з-пад увагі асноўныя вытворчыя моманты.

Асобныя групы садзейнічаньня МБВ, дэпо, пуці, хлебазаводу, Белбудканторы, «Прафінтэрн», «Камінтэрн» яшчэ да працы не прыступілі. У большасьці груп садзейнічаньня пераважна працуюць толькі члены бюро. Адміністрацыя шмат якіх прадпрыемстваў, а таксама партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не дапамагаюць у рабоце групам.

У многіх групах садзейнічаньня адсутнічае вучот і плянавасьць працы, у выніку чаго няма адказнасьці членаў за паасобныя вучасткі работы.

Асноўныя мерапрыемствы, якія намеціла нарада — гэта пераход ад мэтаду самацёку да плянавай працы, зьвяртаючы асноўную ўвагу на вучастку, дзе маюцца прарывы.

Дакуемая сёньня пастанова гарКК-РСІ павінна зрабіць рашучы пералом у галіне адносін адміністрацыі і мясцовых партыйных і прафсаюзных арганізацый да працы груп.

Неабходна ўдарыць па недацэнцы значэньня гэтых ячэек РСІ на мясцох і стварыць адпаведныя ўмовы для разгортваньня іх працы, кіруючы і дапамагаючы групам садзейнічаньня ў іх штодзённай працы па барацьбе з усімі перашкодамі ў выкананьні прамфінпляну.

Іофе.

Ячэйкам РСІ фабрыках і заводах — УСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ ПРАЦЫ

Пастанова ГарКК-РСІ

Заслухаўшы інфармацыю тара ГарКК-РСІ т. Іофэ аб працы груп садзейнічаньня прадпрыемствах і іх працы, дым гарКК РСІ адзначае:

За час верасень — кастрычніка ...ароду арганізавана 15 груп ...нічаньня і 6 на чыгунцы. ...рыя групы садзейнічаньня ...ць становіўся вынікі ў сваёй ...боце ў галіне выяўленьня недахопаў і барацьбе з прычынамі, перашкодамі выкананьню прамф... (акулярная, Лекерта і інш.).

Наладжваецца сувязь паміж ...групамі садзейнічаньня на ...емствах. Апошнія пачынаюць ...маваць і сыгналізаваць аб ...зьявішчах на фабрыках і ...(МБВ чыгунка, акулярная і ...

Момантам, перашкаджаючым ...разгортваньні працы груп ...нічаньня зьяўляецца нагрузка ...членаў груп садзейнічаньня і ...ва члена бюро рознымі аб...абоку партыйных і прафсаюзных арганізацый і неаказваньне ...дзейнічаньня асабліва кіраўніцтва прадпрыемствамі.

На падставе вышэйпададанага прэзыдыум гарКК-РСІ пастанавіў:

Прапанаваць трыкутнікам ...прыемстваў аказваць усялякую ...памогу ў працы груп садзейнічаньня РСІ, стварыўшы належныя ...для разгортваньня іх работы.

Партыйным і прафсаюзным ...зацыям на мясцох вызваліць ...бюро груп садзейнічаньня ...грамадзкіх абавязкаў, ліквідаваць ...груп садзейнічаньня асноўным ...грузкай.

Прапанаваць дырэктарам ...прыемстваў прадастаўляць ...дзейнічаньня РСІ ўсе ўмовы ...працы.

Рэдакцыі газэты **«Віцебскі пралетары»**, шматтыражкам і ...газэтам систэматычна асвятляць ...ньні арганізацыі груп ...ной працы, завастраючы ...ньні шырокага ўцягненьня ...бочых у работу ячэек РСІ ...рыках і заводах.

דעם 4-טן און לעצטן יאר פון פינפיאר
א באלשעוויסטישן אנטקעגנדן געבן דעם זאוואד א פולשטענדיקע אנלאדונג

דער זאוואד „רויטער מעטאליסט" שטייט ווייטער מיט א נים קלארער לאגע מיט דער נייער פראגראם אפן 1932 יאר. ס'שטייט א געפאר, אז אין דעם נייעם יאר זאל זיך ווייטער אי־בערכאזערן די פראגראם־טשעכאדרע פון דעם אלטן יאר.

פריער איז געווען אנגעמערקט אפ־לאזן דעם זאוואד 650 טויזנט רובל אף איבערקאנסטרוקטירן אים. די רעקאנ־סטרוקציע האט זיך שוין געארפט אנ־הויבן אין 4-טן קוואדרעל פון 1931 י., נאר ביז היינטיקן טאג איז נים באו־ווסט צו די רעקאנסטרוקציע וועט פארקומען אדער ניט.

די קאנטראל־ציפערן אף 1932 יאר איז 8.237.000 רובל. די זאוואד־פאר־וואלטונג האט די פראגראם באצייטנס באארבעט און האט אפגעשיקט אף בא־שטעטיקן אין ווייסמעסאל־פארייניקונג, פון דארטן איז דאס אוועק אין סעק־טער פון לאנדווירטשאפטלעכער מאשין־בויונג באם אלפארבאנדישן העכסן סאָ־וועט פון פאלקס־ווירטשאפט און דער לעצטער האט פון פראגראם ארויסגע־וארפן 50 000 שטיק קולטעוואטערס, 10.000 אקערס ד. ט. ל. ד. מ., וואס באלאנגט וועגן מאכן וועגענער, איז נאך די פראגע נים געלייזט, אין פרא־גראם פינורירן זיי ניט, נאר, ווי סיוויזט אויס, זיינען זיי יע אייגעשלאסן אין פראגראם. די פראגע וועגן וועגענער איז אריבערגעטראגן אף צו באארבעטן אין מאסקווע. אפן ערשטן קווארטל איז וועגענער גיט ארייגעשטעלט, דערפאר וואס דער זאוואד איז נאך ניט צוגעפאסט צו דעם.

די פראגראם פון ערשטן קווארטל באשטייט פון פאלגנדע אביעקטן:

זשמיכע־ברעקלער 1500 שטיק, וואַרצלשניידער 2000 שטיק, בולבע־גרעבערס 1000, באראנעס „זיג־זאג" 4000 שטיק, זאפאסנע טיילן אף 50.000 רובל, עקספארטנע אויסארבעטונג (שטריי־שניידערס און אקערס) אף 38.000 רובל.

די פראגראם אין פארגלייך מיטן ערשטן וואריאנט, איז באשטעטיקט גע־וואָרן אף 67 פראצענט. אף 7.250.000 ד. ה., ווייניקער אף א מיליאן רובל פון דעם ערשטן וואריאנט. פון דער אלגעמיינער סומע פאלט 2.2500.000 ר. אף די וועגענער.

אף דער באראטונג פון אדמיניסטרא־טיוו־טעכנישן פערסאנאל, וועלכע איז פארגעקומען דעם 9 נאָיאבער, זיינען באהאנדלט געוואָרן די קאנטראל־ציפערן אפן 1932־טן יאָר, דאס אויספילן דעם פראפינפלאן און די לאגע ווי צו פארבעסערן דעם אויסכוס פון דער פראָ־דוקציע.

די פאבריק צוגלייך מיט דער גאנ־צער ניי־אינדוסטריע אפן 1932־טן יאָר ווערט באדייטנד פארגרעסערט לויט דער צאל ארבעטער אויך לויט דער צאל ארויסגעלאזענער פראדוקציע. די פאבריק וועט דארפן ארויסלאזן אף 30 מיליאָן רובל פארטיקע סכוירע.

דאס זערבסטקאסט וועט דארפן פארקלענערט ווערן אף 5 פראצ.

אין ערשטן קווארטל 1932־טן יאָר ווערט דער הויפט־צעך—צעך פון ווינ־טער־פאלטע פארשטארקט ווערן מיט ארויסלאזן א גרעסערע צאל בגאדים און פראָדעזינקעס.

אם די פראגראם פון מאכן וועגענער זער זאוואד, נאָר אזא אף אסאך טייערער מאכ־ציע. מיר וועלן ניט קע־אויסנוצן די קאדראווע ארבעטס־קראפט.

ארויסגייענדיק פון דאס די געהעריקע ארגאנען פראגע וועגן איבערקוקן דער זאוואד אין לעצ־פינפיאר מיט האבן א פולש־לאדונג.

א.

דעם 4-טן און לעצטן יאר פון פינפיאר
א באלשעוויסטישן אנטקעגנדן

געבן דעם זאוואד א פולשטענדיקע אנלאדונג

דער זאוואד „רויטער מעטאליסט" שטייט ווייטער מיט א נים קלארער לאגע מיט דער נייער פראגראם אפן 1932 יאר. ס'שטייט א געפאר, אז אין דעם נייעם יאר זאל זיך ווייטער אי־בערכאזערן די פראגראם־טשעכאדרע פון דעם אלטן יאר.

פריער איז געווען אנגעמערקט אפ־לאזן דעם זאוואד 650 טויזנט רובל אף איבערקאנסטרוקטירן אים. די רעקאנ־סטרוקציע האט זיך שוין געארפט אנ־הויבן אין 4-טן קוואדרעל פון 1931 י., נאָר ביז היינטיקן טאג איז נים באו־ווסט צו די רעקאנסטרוקציע וועט פארקומען אדער ניט.

